СЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
______________А.В.Клімовіч
_____________2024

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога адкрытага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні і маладзёжнай музыкі “Нёманская Art -хваля”

1. Дадзеная іструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога адкрытага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні і маладзёжнай музыкі “Нёманская Art -хваля” (далей- конкурс).
2. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення новых таленавітых выканаўцаў у галіне вакальнага мастацтва.
3. Задачы конкурсу:
пошук таленавітых выканаўцаў, прадстаўнікоў творчай моладзі, з мэтай далейшага развіцця і падтрымкі іх таленту і выканальніцкага майстэрства;
стварэнне неабходных умоў для творчага развіцця асобы, захавання самабытнасці беларускай культуры, нацыянальнай самасвядомасці і патрыятычнага выхавання моладзі;
усталяванне творчых кантактаў, садзейнічанне ў захаванні адзінай культурнай прасторы, выкарыстанне ў дзейнасці лепшых дасягненняў сусветнай мастацкай культуры;
прафарыентаванне таленавітай моладзі на атрыманне ў далейшым творчай прафесіі.
4. Арганізатары конкурсу: упраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”.
5. Конкурс праводзіцца раз у год.
6. Конкурс праводзіцца ў адзін этап, праводзіцца на працягу аднаго дня 08 лютага 2025 года ў канцэртнай зале УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”. Аб часе правядзення конкурсу будзе паведамлена дадаткова.
7. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, на афіцыйных сайтах упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і ўстановы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”. Па меры паступлення інфармацыя можа аднаўляцца і павінна ўтрымліваць звесткі аб часе, месцы правядзення конкурсу, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі выкананняў удзельнікаў, парадку і тэрмінах абвяшчэння вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

8. У конкурсе могуць прымаць удзел навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Гродзенскай вобласці ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў (далей, калі не вызначана іншае, - удзельнікі конкурсу).

9. Конкурс праводзіцца па намінацыях:
“эстрадны вакал”: салісты, ансамблі;

10. Для ўдзельнікаў конкурсу вызначаюцца тры ўзроставыя групы:
ад 6 да 9 гадоў уключна (першая група);
ад 10 да 14 гадоў уключна (другая група);
ад 15 до 18 гадоў (трэцяя група).

11. Умовы ўдзелу ў конкурсе:
удзельнікі конкурсу выконваюць адну песню пад якасную фанаграму (мінус);
фармат песні - не больш за 4 хвіліны;
не дапускаецца прапяванне музычных фраз з выкарыстаннем кампутарнай апрацоўкі галасу;
дапускаецца выкарыстанне бэк-вакалу;
дапускаецца ўдзел балета (харэаграфічнай групы).

12. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна не пазней 22 студзеня 2025 года падаць наступныя матэрыялы на электронную пошту yana-yanukevitch@yandex.ru:
анкету-заяўку ўстаноўленай формы (дадатак 1);
фанаграму “мінус 1” выкананай песні;
квітанцыю аб аплаце (фота/скан).

13. Падача заяўкі ўдзельнікамі азначае згоду на апрацоўку арганізатарамі прадстаўленых імі персанальных дадзеных з мэтай удзелу ў конкурсе, узнагароджанні пераможцаў, афармленні неабходных дакументаў, звязаных з правядзеннем конкурсу, згоду на фотаздымку, відэаздымку, аўдыёзапіс конкурсных выступаў. Прымаючы ўмовы дадзенай інструкцыі, удзельнікі прадастаўляюць арганізатарам права ажыццяўляць публікацыю вынікаў конкурсу у сродках масавай інфармацыі і сетцы Інтэрнэт.

14. У фінале конкурсу песні выконваюцца ў рэжыме жывога гуку ў суправаджэнні запісанай музыкі і бэк-вакалу. Замена адабраных песень перад фіналам конкурсу не дапускаецца. У дзень конкурсу ў кожнага выканаўцы павінна быць з сабой фанаграма, запісаная на USB - носьбіт у фармаце mp3. Кожны файл павінен змяшчаць наступнае: назву калектыву/імя саліста, горад, назва песні.

15. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляе журы конкурсу (далей- журы). У склад журы заключнага этапу конкурсу ўваходзяць педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры Гродзенскай вобласці і Рэспублікі Беларусь, творчыя работнікі, дзеячы культуры і мастацтва.

16. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі ацэнкі: вакальныя дадзеныя, выканальніцкае майстэрства, акцёрскае майстэрства, сцэнічны імідж, якасць аранжыроўкі фанаграмы.

17. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца:
дыпломам ўладальніка Гран-пры,
дыпломамі лаўрэатаў I, II і III ступені ў кожнай намінацыі і ўзроставай групе;
дыпломамі дыпламантаў I, II і III ступені;
а таксама прызамі.

Журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы.

18. Фінансаванне выдаткаў па арганізацыі і правядзенні заключнага этапу конкурсу ажыццяўляецца за кошт добраахвотных сродкаў удзельнікаў, пералічаных за ўдзел у конкурсе ў памеры адной базавай велічыні бел.руб. – салісты, 1,5 базавай велічыні бел.руб. – ансамблі, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Аплата за ўдзел у конкурсе пералічваецца на рахунак установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”. Банкаўскія рэквізіты: BY74 АКВВ 3632 0000 0068 0400 0000, ГОУ № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК АКВВВY2Х, ОКПО 02071760. (пазабюджэт), УНП 500024001.

19. Сума ўзносу ўдзельніка ўключае выдаткі:
на статутную дзейнасць кампаніі арганізатара;
на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне;
выраб дыпломаў, сувенірнай прадукцыі;
прызы пераможцам;
адміністрацыйныя выдаткі;
расходныя матэрыялы;
правядзенне рэкламнай кампаніі;
аплату працы прыцягнутых спецыялістаў і тэхнічных работнікаў;
камунальныя выдаткі.

20. У выпадку адмовы ад удзелу ў конкурсе арганізацыйны ўзнос не вяртаецца.

21. Праезд і пражыванне ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт уласных сродкаў удзельнікаў і сродкаў накіроўваючага боку.

22. Кантактная інфармацыя:
УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, 230009, г. Гродна, вул. БЛК, 23
http://artcollege.by/

23. Тэлефоны арганізатараў конкурсу:
+375295859080 МТС Стракалава Святлана Мікалаеўна
+375298876247 МТС Янукевіч Яна Юр’еўна
80152565853 Чабатарэвіч Наталля Мікалаеўна

Дадатак 1
да іструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога адкрытага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні і маладзёжнай музыкі "Нёманская Art-хваля"

АНКЕТА-ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным адкрытым конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні і маладзёжнай музыкі "Нёманская Art-хваля"

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку саліста-вакаліста (поўная назва калектыву*)

______________________________________________________________

______________________________________________________________

2. Дата нараджэння__________________________________________

3. Месца вучобы, база дзейнасці калектыву ___________________________

______________________________________________________________

4. Намінацыя, узроставая катэгорыя________________________________

5. Электронная пошта, нумар тэлефона ўдзельніка_____________________

______________________________________________________________

6. Назва песні, аўтар музыкі, аўтар слоў, на якой мове выконваецца, працягласць_______________________________________________

______________________________________________________________

7. Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (кіраўніка)___________________

______________________________________________________________

8. Электронная пошта, нумар тэлефона педагога (кіраўніка) _____________

______________________________________________________________

9. Неабходнае абсталяванне _____________________________________

10. Кароткая творчая характарыстыка выканаўцы (калектыву) ___________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

З умовамі ўдзелу ў конкурсе згодны __________
(подпіс)

* *для калектыву таксама запаўняецца дадатак 2*

Дадатак 2
да іструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога адкрытага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні і маладзёжнай музыкі “Нёманская Art-хваля”

СПІС удзельнікаў
(для ўдзельнікаў калектыву)

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Дата нараджэння |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |